# «З КІРМАШУ БЕЗ БАБЫ ДЗЕД ПРЫКАЦІЎ ДАДОМУ...»

**Што было — было. Адна жанчынка вырашыла 90-годдзе адзначыць, запрасіла сваіх сябровак, купіла добрай гарбаты, пірожных, мандарынаў... А паколькі памяць ужо не тая, у кухні шпаргалку пакінула, што і за чым падаваць: пункт першы — напаіць чаем, другі — пачаставаць піражнымі, трэці — паставіць на стол мандарыны.**
**Тым часам госці на парог. Гаспадыня прывяцела іх, на кухні зірнула ў шпаргалку, прынесла гарбаты — усе выпілі. Яна зноў схадзіла ў кухню, яшчэ раз прачытала пункт... першы, яшчэ раз вярнулася з чайнікам... І вось так разоў шэсць ці сем.**

Урэшце госці напіліся і развіталіся. «Наша Верачка зусім састарэла, — па дарозе дамоў пашкадавала адна з сяброўак. — Мы ж гадзіны са дзве ў яе прабылі, а яна хоць бы чаю наліла». — «А мы хіба ў Веры былі?» — здзівілася другая. — «Вы пра каго там? — насцярожылася трэцяя. — Хто такая Вера?»

А яна, юбілярка, тым часам занесла ў кухню кубкі, адкрыла халадзільнік, убачыла там некранутыя піражныя ды мандарыны і цяжанька ўздыхнула: «Усе на мяне забыліся. Ніхто не прыйшоў — нават сёння».

Людзі вось гэтак могуць, на жаль. Іх гадаванцы таксама на многае здатныя. Сведчаннем таму радкі, якія «падказаў» чытачам апошні конкурсны здымак: можна паглядзець на верхні яшчэ раз і прызнаць, што мае рацыю **спадар Мікола Кісель з Мінска**:

*Бобік спрасонку*
*Глядзіць — не міргае.*
*Кот, як шалёны,*
*Ўкруг воза лятае:*
*Пакуль яны спалі*
*У шапку вось тут,*
*Злодзеі скралі*
*Каня і хамут!*

Але ж гэта — палова бяды — можа, міліцыя знойдзе. «У нас з жонкай, — піша **спадар Мікалай Касмачэўскі з Наваполацка**, — ёсць домік у вёсцы, так што даводзіцца працаваць на зямлі, важдацца з рознай сялянскай жывёлай — катамі, сабакамі, авечкамі... А вось у нашага суседа —

*Быў канёк, ды захварэў...*
*Апусцеў раптоўна хлеў!*
*Але ж хочацца — да слёз,*
*Хоць каго запрэгчы ў воз!*

Гэта, як трэба разумець, і пра здымак, то-бок пра сабаку з катом, і ўвогуле...

Дарэчная заўвага ад **спадара Хоміча з Гродна**:

*Шмат ахвотных пад'язджаць —*
*У вазок залегчы,*
*Шмат ахвочых паганяць!*
*Ды... каго б запрэгчы?*

Часам і сапраўды — няма каго. Шчасце — што ёсць каму. Пакуль. Сярод найпершых ахвотных — **спадар Іван Астроўскі з Мінска**, які так і піша:

*Я б канька ўміг запрог*
*І ля Шарыка прылёг...*
*Каб не проста пакатацца,*
*А паехаць з ім на працу!*
*І рабіць, рабіць да поту*
*Усю вясковую работу...*
*Вось ці верне толькі хтось*
*Маю вёску й маладосць?*

Балючае пытанне. Канстатацыя «фактаў» — зноў жа да здымка і наогул — ад **спадарыні Ніны Бурко з Бярэзіншчыны**:

*«Жулік спец!» ды «Жулік ас...»,*
*«Жулік выцягне калгас!»*
*Спадзяваліся дарма,*
*Бо й каня ўжо няма!..*
*Цюцька так бы не сказаў —*
*Не па ім маркоціца:*
*Гаркне з воза сваё: «Гаў!»*
*І хай Мурка носіцца.*

Вырашае, так бы мовіць, вытворчыя пытанні, ці (на думку **спадара Віктара Сабалеўскага з Узды**), кіпці рве з гэтага калгаса:

*Раз брахнуў Жучок на Воўка*
*(Той у вёску заблукаў) —*
*Гаспадар яму «абноўку» —*
*На пярыну спаць паклаў...*
*Кот штодзень мышэй ганяе,*
*А яму увагі — нуль.*
*«Больш на мышак, — абяцае —*
*І галодны не зірну!»*

Тут, магчыма, тост дарэчы — пра такога ж гаспадара. Ён вырашыў ката завесці. Прытуліў першага і нарадавацца не мог, бо вельмі ж удалы: за тыдзень-другі ўсіх мышэй на сялібе вынішчыў — заставалася толькі сачыць, каб новыя не з'явіліся... Што таксама работа! Ды гаспадар не зразумеў яе. «Гультая карміць? А за што?» — спытаў сам сябе і выгнаў таго рупліўца...

Другі яго кот хітраваць прыдумаў: мышку зловіць, трохі прыдушыць, «для справаздачы» гаспадару пакажа і выпусціць, каб потым зноў свой спрыт паказаць.

Ён, кажуць, і сёння на хутары жыве...

Дык вып'ем жа за знаходлівасць, бо куды без яе? Ну хоць бы і работнікам міліцыі, бо, паводле **сужэнцаў Астроўскіх**:

*Рэкс трымае пад сакрэтам,*
*Што ляжыць у возе гэтым.*
*Можа, грошы, можа, дровы*
*Пад пасцілкай адмысловай...*
*Каб пажыць хоць трохі ў шчасці,*
*Шмат спрабуючых украсці.*
*А ўжо падмануць...*
*Пан Быкоўскі выхваляўся,*
*Што каня купіў — на пяць!*
*Не на тых аднак нарваўся,*
*Каб на веру гэта ўзяць:*
*— Вы, паночку, пакажыце,*
*Хоць здалёк таго каня.*
*— Каля воза там ляжыць ён...*
*Там ляжала... кацяня.*

Убачыў яго **спадар Віктар Сабалеўскі**.

З тога ж канверта і яшчэ восем радкоў, навеяных класікай:

*Кот, Сабака і Гусак*
*Сплянавалі падарожжа.*
*Нібы Лебедзь, Рак, Шчупак —*
*Верхаводзіў кожны.*
*Потым першы паляцеў,*
*Не зірнуўшы на Ката.*
*Жук на воз паважна сеў...*
*А той воз — і сёння там.*

Бо згоды не было ў дзеяннях.

Чаго яшчэ, ведае **спадар Валерый Гаўрыш з Чавусаў**:

*Воз даўно стаіць вось так?*
*З месца не кранецца...*
*Усё таму, што гультаям*
*Ён не паддаецца.*

З таго ж канверта і згадка пра нашага айчыннага класіка Кандрата Крапіву. Помніце: «Ехаў дзедка на кірмаш, / З ім на возе баба...»

Сяброўка расказвала, як яны, чацвёра зусім незнаёмых пацыентаў палаты рэанімацыі, ноччу, уголас, па чарзе, па радку чыталі гэтую байку і ніхто не збіўся — усе ўсміхаліся — вярталіся да жыцця, каб потым, як спадар Гаўрыш, працяг да байкі... прыдумаць:

*З кірмашу*
*без бабы*
*дзед*
*Прыкаціў дадому.*
*(Дзе звяглівай гэтай след, —*
*Чорту невядома)...*
*Дзед жа —*
*зноўку халасцяк,*
*І не безгаловы,*
*Бо ў яго і кот — рысак*
*І вазочак новы!*
*А вось гэта —*
*Хоць і даўні інвентар,*
*Але ж бачна —*
*гаспадар!*
*Яшчэ коніка трымае*
*І, напэўна ж, сілу мае,*
*Да зямлі сваёй прырос —*
*Жыць не можа без калёс!*
*Пры такіх —*
*жывуць са смакам —*
*І не толькі кот з сабакам!*



Ну чым не шлюбная абвестка — з падачы **спадароў Гаўрыша і сужэнцаў Астроўскіх** (адрас дзеда ў рэдакцыі)! Як і некалькі штрыхоў да яе — ад **спадарыні Валянціны Гудачковай з Жыткавічаў**:

*Мода тая ўсім вядома:*
*«Спяць» калёсы каля дома,*
*А на іх красуюць кветкі...*
*Яська ўсё гэта прыбраў*
*І пайшоў араць палеткі:*
*Як не будзеш ты рабіць,*
*То й ката не пракарміць.*

Што праўда, тое праўда: нехта — каб гэта зрабіць — ідзе працаваць, зарабляць, а нехта...

«Здараецца, на жаль,— піша **спадар Мікалай Старых з Гомеля**, — што дачнікі, а то і вяскоўцы, з'язджаючы на зіму ў гарады, кідаюць катоў ды сабак, кідаюць на выжыванне, а дакладней — на выміранне... Але ж, дзякаваць богу, не зніклі яшчэ і людзі добрыя:

*Мурка з Жучкай свайму дзедку*
*Памагалі цягнуць рэпку,*
*Сцераглі усё, што сеяў,*
*Ад мышэй і ад зладзеяў.*
*Вось і дзед перад зімою*
*Забірае іх з сабою —*
*Не кідае ў чыстым полі*
*Зімаваць адных на волі.*

Не будзем пісаць, што ён малайчына, бо тады прыйдзецца пахваліць і бабуль: яны цераз дарогу маладых цяпер пераводзяць, бо тыя на хаду, на айфонах эсэмэскі пішуць.

А можа і... вершы на наш звяздоўскі конкурс, як сямікласніца СШ № 3 **Карына Цануніна** з Вілейкі:

*Звініць наўкола цішыня,*
*І сярод поля, па дарозе,*
*Спрабуе кот*
*замест каня*
*Сабаку пракаціць*
*на возе.*

Што цалкам зразумела, бо (гляньце яшчэ раз!) сімпатычны цюцька! Такога проста грэх не пагладзіць. І не пракаціць. Як, дарэчы, і іншых улюбёнцаў!

«Сабака з майго дзяцінства, — успамінае, напрыклад, **спадар Іван Сіманёнак з Паставаў**, — пражыў вельмі цікавае і доўгае жыццё. З прычыны сваёй бяскрыўднасці ён ні дня не прасядзеў на прывязі, найлепшым сябрам лічыў каня, а сваёй хатай — звычайны воз. Ён спаў там нават пад снегам... Амаль такі ж сабачка і на чарговым конкурсным здымку: набегаўся, бедны, прылёг адпачыць ды яшчэ і паганарыцца.

Чым? Слухайце:

*Перад Муркаю-раднёй*
*Тузік выхваляўся:*
*«Эх, удалы быў дзянёк,*
*З воляй пабратаўся!*
*Поле, кусцік, сенажаць —*
*Я памецій кожнае!*
*Дамаседкам не спазнаць*
*Шчасце падарожнае!»*

Адкуль і лагічны заклік, дасланы **спадарыняй Любоўю Чыгрынавай з Мінска**:

*Прыязджайце, ягамосці,*
*У сядзібу дзядзькі Косці!*
*Жыўнасць розная тут ёсць*
*Ды чысцюткае паветра.*
*І адна у горле «косць»:*
*А куды ж сходзіць да ветру?*

Гэта — балючае пытанне, і не толькі для коткі. «Звязда» не раз да яго звярталася. Адзін дыялог не грэх і паўтарыць, бо ён, на жаль, не страціў сваёй актуальнасці. У госці-замежніцы, якая пабывала не толькі ў гарадах, але і ў вёсках Беларусі, на развітанне спыталі пра ўражанні. Адно з галоўных: «Вашы мужчыны не любяць вашых жанчын», — сказала кабета... І трэба было чуць, што тут пачалося?! З усіх бакоў панеслася: «Няпраўда! Хлусня! З чаго вы ўзялі?» Крычалі, вядома ж, мужчыны. Госця адказала ім — ціха, але досыць пераканаўча: «Калі б вы любілі сваіх жанчын, то ніколі б не дазволілі ім хадзіць па патрэбе туды, куды яны ходзяць»...

Зрэшты, гэта іншая тэма, іншая праблема, і ў вырашэнні яе, што варта прызнаць, зрухі ёсць — месцамі.

Хочацца верыць, што месцаў такіх будзе больш і больш, бо...

Фінальныя радкі ад **спадара Мікалая Касмачэўскага**:

*Выглядае, што канёк*
*Прытаміўся і ўцёк.*
*А вазок жа трэба везці:*
*До хлебок халяўны есці*
*Ды лайдачыць на двары —*
*Будзем, як гаспадары!*

Хто за?

Аднагалосна?!

Значыць, 2019-ы пачынаецца добра. Тады кароткая аўтарская заўвага:

*Ціхай сапай, як той кот,*
*Ён прыходзіць — Новы год.*
*Белы? Ці рыжэйшы?*
*Хай... не карацейшы!*

Вось на гэтым і завершым чарговы конкурсны агляд. Засталося назваць пераможцу, але найперш — нагадаць, што подпіс прыдумваўся да здымка, на якім «ці то Дуня, ці то Маня ногі мыла ў фантане» (гл. нумар «Звязды» за 21 лістапада). Дык вось. Паводле меркаванняў вялікага чытацкага журы, найлепшыя радкі пра яе даслалі **спадары Віктар Сабалеўскі з Узды, Валерый Гаўрыш з Чавусаў, спадарыні Любоў Чыгрынава з Мінска, Іна Алісевіч з Уздзеншчыны, Соф'я Кусянкова з Рагачоўшчыны і Наталля Шкут з вёскі Прудок Светлагорскага раёна.**

З гэтым вось апошнім меркаваннем пагадзілася і журы маленькае рэдакцыйнае. Такім чынам прыз у выглядзе падпіскі на дарагую сэрцам газету на другі квартал 2019 года накіроўваецца на Светлагоршчыну.

Вы хацелі, каб «Звязда» прыходзіла да вас? Тады, што называецца, наперад: здымак дадаецца, прапановы подпісаў — кароткіх (не больш за восем радкоў) і дасціпных — прымаюцца і разглядаюцца. Шанц на выйгрыш ёсць у кожнага!

**Валянціна ДОЎНАР.**
**Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.**



**АД ІХ ЖА** шчырыя прабачэнні ўсім, чые радкі не прайшлі строгага конкурснага адбору, і два пытанні на засыпку: вы ўжо адзначылі свае 90-годдзе? І чытаеце газету? Тады вам — як кажа моладзь — нашы рэспект і ўважуха! Вам да гэтага юбілею яшчэ далёка, але ці хацелі б тады запрасіць гасцей, напаіць іх чаем з піражнымі і мандарынамі? Тады — гэта вам любы доктар скажа — варушыцеся самі і варушыце мазгамі! Можна, у тым ліку, выбіраючы найлепшыя чужыя подпісы да здымкаў. Альбо — складаючы свае. Паспяхаў!